**КІ́ЕЎСКІ ЛЕ́ТАПІС**, гістарычны і літаратурны помнік перыяду Кіеўскай Русі. Адлюстроўвае падзеі 1118—1200. Уваходзіць у Іпацьеўскі летапісны звод і з'яўляецца працягам «*Аповесці мінулых гадоў*». Папярэднічае *Галіцка-Валынскаму летапісу*. Аўтарства прыпісваецца ігумену Выдубецкага манастыра Маісею, складзены на падставе стараж.-рус. летапісаў і сямейных хронік кіеўскіх князёў сярэдзіны 12 ст. Асн. тэма летапісу — гісторыя Кіеўскай зямлі. Аўтар падае апісанні жыцця, паліт. дзейнасці кіеўскіх князёў, адлюстроўвае драм. староннкі барацьбы паўд.-рус. княс-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

тваў з полаўцамі. Крытычна ставіцца да сварак паміж рус. князямі. У К.л. захаваліся звесткі пра падзеі ў Полацкай зямлі. Паводле некаторых бел. навукоўцаў (В.Чамярыцкі), складальнік К.л. мог карыстацца фрагментамі згубленага *Полацкага летапісу*. У летапіс асобнымі творамі ўключаны аповесць пра забойства кн. Андрэя Багалюбскага ў 1174 і аповесць пра паход кн. Ігара Святаславіча на полаўцаў 1185 і інш. Мова помніка блізкая да нар. з некаторымі царк.-слав. элементамі, насычаная дыялогамі, прымаўкамі і прыказкамі.

*В.І.Еўмянькоў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.Кулешова